Год выдання 31-ы

КРАЕВЕДЧЕСКИЙ СОЛИГОРСКА

# Іх рукі будавалі калійны





Свой уклад у будаўніцтва калійнага камбіната ўнеслі і маладыя будаўнікі Таня Бяліцкая і Роза Дрызгаловіч. Зменныя заданні кожная з іх выконвала на 120—130 працэнтаў.

# Справы маладых, працавітых

У АДКАЗ на Заклік ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР намнога раней вызначанага тэрміну ўведзена ў дзеянне першая чарга калійнага камбіната. Выдатнай працоўнай перамогай будаўнікі сустрэлі снежаньскі Пленум ЦК КПСС.

Работы па будаўніцтву камбіната пачаліся пяць год назад. Тут, на чыжэвіцкай зямлі, 10 жніўня 1958 года будаўнікі заклалі першы камень на будаўніцтве горада шахцёраў —Салігорска. А непадалёку, на прамысловай пляцоўцы, шахтабудаўнікі пачалі замарозку пад праходку ствалоў.

Тэмпы работ на будаўніцтве расшыраліся з кожным месяцам і годам. Ужо 25 красавіка 1959 года быў узнят першы шахтапраходчы капёр над ствалом № 2, а праз кароткі час пачалася і праходка ствала. Будаўнікі шахт спяшаліся і ўжо 30 красавіка на глыбіні 414 метраў дасягнулі першага прамысловага гарызонту калійнай солі. Здабыча сільвініту пачалася на 9 месяцаў раней вызначанага тэрміну.

Услед за гэтым за кароткі тэрмін былі пабудаваны вопытная ўзбагачальная фабрыка, а затым прамысловая фабрыка. Пабудаваны камплекты аб'ектаў першага, другога і трэцяга ствалоў, цеплацэнтраль, блок рамонтна-механічных цэхаў , склады, горнабытавы камбінат, транспартныя галерэі, сушыльна-фільтравальны корпус і іншыя аб'екты.

За 5 год у Салігорску будаўнікі здалі ў эксплуатацыю 80 тысяч квадратных метраў жылой плошчы. Тут працуюць два ўнівермагі, дзве сярэднія школы, горнахімічны тэхнікум, шырокаэкранны кінатэатр, Клуб будаўнікоў і г. д.

Усё гэта вынік самаадданай працы будаўнікоў, сярод якіх пераважная большасць камсамольцаў і моладзі. Хочацца назваць ветэрана будоўлі — комплексную брыгаду Васіля Нікіценкі. У гэтым калектыве 6 камуністаў і 13 камсамольцаў. Узоры працы паказваюць таксама члены брыгад Івана Шараева з БУ-122, праходчая брыгада Івана Пракудзіна, Язэпа Высоцкага з завода жалезабетонных вырабаў.

Добрымі справамі сустрэў Пленум ЦК КПСС і калектыў рудніка. Ён датэрмінова — 5 снежня выканаў гадавы план здабычы сільвініту.

Рукі маладыя, працавітыя не ведаюць стомы. Ім яшчэ многа патрэбна зрабіць, каб на зямлі засвяціліся зоркі камунізма.

С. КУНЦЭВІЧ,
сакратар Салігорскага прамыслова-вытворчага камітэта ЛКСМБ.